**Качаноўскі Уладзімір Васільевіч** (1853–1901) - гісторык, філолаг-славяназнавец, магістр філалогіі (1882). Даследаваў сербскія, харвацкія. візантыйскія і іншыя помнікі як гістарычныя крыніцы. Нарадзіўся 1 сакавіка 1853 г. у в. Вялікі Лес Кобрынскага павета. З сям'і святара. Закончыў гісторыка-філалагічны факультэт Варшаўскага ўніверсітэта (1876). У 1878-1886 гг. працаваў у Варшаўскім універсітэце. У 1886-1888 гг. У. Качаноўскі - прыват-дацэнт Казанскага ўніверсітэта, у 1889-1901 гг. Нежынскага гісторыка-філала-гічнага інстытута. Чытаў лекцыі на кафедрах царкоўна-славянскай мовы, гісторыі рускай мовы і славянскіх дыялектаў.

**Качановский Владимир Васильевич** // Большая советская энциклопедия : [в 30 т.]. – М., 1973. – Т. 11. – С. 550.

**Качаноўскі Уладзімір Васільевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. – С. 195.

**Кочановский Владимир Васильевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 506.

**Чарапіца, В.** Качаноўскі Уладзімір Васільевіч / Валерый Чарапіца // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1997. - Т. 4. - С. 157.

**Качаноўскі Уладзімір Васільевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 66-68.

### *45 гадоў з дня нараджэння Н. Ю. Колбас (1978)*

**Колбас Наталля Юр'еўна** – кандыдат біялагічных навук, дацэнт. Колбас (Куц) Наталля нарадзілася ў 1978 г. у г. Кобрыне Брэсцкай вобласці. З'яўляецца загадчыкам кафедры хіміі біялагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Член Савета біялагічнага факультэта, кіраўнік студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі «Экалагічная біяхімія».

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Колбас Наталля Юр'еўна** // Самая «першая» : інфармацыйна - бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 27. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Колбас Наталля Юр'еўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 72 : каляр. фота.

### *100 гадоў з дня нараджэння Д. А. Кухарчука (1923)*

**Кухарчук Дзмітрый Аляксандравіч** нарадзіўся ў 1923 г. у Свішчы Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну ў партызанскім атрадзе імя Чапаева, у стралковай дывізіі 1-га Беларускага фронту. Удзельнічаў у вызваленні Варшавы, у баях на тэрыторыі Германіі. Дзень Перамогі сустрэў у Берліне. Пасля вайны жыў у в. Тэўлі, працаваў на чыгунцы.

**Кухарчук Дзмітрый Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 243. – (Крутымі дарогамі вайны).

### *110 гадоў з дня нараджэння Р. В. Левага (1913)*

**Левы Рыгор Васільевіч** нарадзіўся ў 1913 г. у в. Балоты. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў сувязным партызанскіх атрадаў імя Суворава і імя Кірава, партызанам атрада імя Катоўскага, змагаўся ў аператыўнай групе. У красавіку 1944 г. загінуў у баі з фашыстамі.

**Левы Рыгор Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 222. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *95 гадоў з дня нараджэння В. С. Лось (1928)*

**Лось Вольга Сцяпанаўна** нарадзілася ў 1928 г. у в. Рашын Драгічынскага раёна. У 1950-1953 гг. працавала настаўніцай у Дзівінскай сярэдняй школе, з 1958 г. - у вячэрняй школе Кобрына, у 1964-1969 гг. – настаўніца беларускай мовы і літаратуры ў СШ № 5. Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1974 г.

**Лось Вольга Сцяпанаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 430. –(Вызначыліся працай).

**Лось Вольга Сцяпанаўна** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 111. : фат.

### *105 гадоў з дня нараджэння Б. Н. Лоташ (1918)*

**Лоташ Барыс Навумавіч** нарадзіўся ў 1918 г. у Кіеве. Партызан атрада імя Катоўскага, камандзір аддзялення разведкі. Удзельнічаў у вызваленні Брэстчыны ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Лоташ Барыс Навумавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 235. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

***105 гадоў з дня нараджэння М. Р. Лук’янчанкі (1918)***

**Лук’янчанка Мікалай Рыгоравіч** нарадзіўся ў 1918 г. у Харкаве. Закончыў Батайскую вышэйшую школу авіяцыйных пілотаў (1941). У гады Вялікай Айчыннай вайны служыў у 18-м гвардзейскім знішчальным авіяцыйным Віцебскім палку. Зрабіў 640 баявых вылетаў, правёў 100 паветраных баёў. У складзе эскадрыллі «Нармандыя-Нёман» удзельнічаў у вызваленні Віцебска, Оршы, Мінска, фарсіраванні Немана, у баях за Усходнюю Прусію. Узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Кобрыне.

**Лук’янчанка Мікалай Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 244. – (Крутымі дарогамі вайны).

***90 гадоў з дня нараджэння М. П. Лясняка (1933)***

**Лясняк Мікалай Піліпавіч** нарадзіўся 18 студеня 1933 г. у в. Барысава Кобрынскага раёна. Прафесіі хлебароба прысвяціў усё сваё жыццё. Амаль паўстагоддзя ён апрацоўваў палі Кобрыншчыны. За сумленную і актыўную працу ў снежні 1972 г. удастоены ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга. У 1981 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР за самаадданую шматгадовую працу ўзнагародзіў трактарыста калгаса «Новы шлях» М. П. Лесняка ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

**Лясняк Мікалай Піліпавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 62. : фат.

***100 гадоў з дня нараджэння А. Ф. Малянкова (1923)***

**Малянкоў Аляксей Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1923 г. У Вялікую Айчынную вайну прайшоў шлях ад камандзіра батарэі да начальніка разведкі артылерыі 9-га гвардзейскага Брэсцкага стралковага корпуса. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вайны палкоўнік, кандыдат ваенных навук, дацэнт, аўтар кніг аб Вялікай Айчыннай вайне.

**Малянкоў Аляксей Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 236. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

***100 гадоў з дня нараджэння М. Д. Мельніка (1923)***

**Мельнік Мікалай Дзянісавіч** нарадзіўся ў 1923 г. У Вялікую Айчынную вайну - камандзір узвода, памочнік камандзіра, камандзір батальёна ў 60-м гвардзейскім Кобрынскім артылерыйскім палку. Удзельнік вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі.

**Мельнік Мікалай Дзянісавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 236. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

***100 гадоў з дня нараджэння М. П. Мікуліка (1923)***

**Мікулік Міхаіл Паўлавіч,** нарадзіся ў 1923 г. у в. Магдалін. У Вялікую Айчынную вайну ў партызанскім атрадзе імя Суворава брыгады імя Молатава, у Чырвонай арміі. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына, размініраванні населеных

пунктаў у Польшчы і Германіі, наладжванні пантонных і паромных перапраў. Пасля вайны жыў і працаваў у в. Мазічы, у Кобрыне.

**Мікулік Міхаіл Паўлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 236. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *105 гадоў з дня нараджэння А. Р. Навумчыка (1918)*

**Навумчык Аляксей Рыгоравіч** нарадзіўся ў 1918 г. у в. Стрыі. Удзельнічаў у падпольнай барацьбе ў Заходняй Беларусі. У 1939 г. выбраны старшынёй Засімскага сельсавета. У Вялікую Айчынную вайну - арганізатар партызанскага руху ў Дахлаўскім лесе, камандзір разведкі ў партызанскім атрадзе імя Чапаева, брыгадзе імя Чапаева. Пасля вайны жыў і працаваў у Кобрыне.

**Навумчык Аляксей Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 216. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

### *100 гадоў з дня нараджэння Г. М. Настасіча (1923)*

**Настасіч Георгій Міланавіч** (1923–1999) - палкоўнік. Нарадзіўся 29 снежня 1923 г. у г. Біеліна (Югаславія). У жніўні 1962 г. прызначаны камандзірам сфарміраванага ім 65-га асобнага верталётнага палка, які з 1964 г. базіраваўся ў Кобрыне. З 1970 г. у адстаўцы, жыў у Мінску. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, а таксама югаслаўскімі «За заслугі перад народам» II ступені і «За храбрасць». Імем Г. М. Настасіча названа вуліца ў Кобрыне.

**Настасіч Георгій Міланавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 438 (Імі ганарацца землякі).
**Шевченко, А.** Лётчик-легенда / Алла Шевченко // Кобрин-информ. - 2007. - 1 ноября. – С. 3.

### *65 гадоў з дня нараджэння У. П. Падпалава (1958)*

**Падпалаў Уладзіслаў Паўлавіч** – беларускі вучоны ў вобласці клінічнай медыцыны, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, выдатнік аховы здароўя. Доктар медыцынскіх навук (1996), прафесар (2005). Нарадзіўся 9 жніўня 1958 г. у в. Імянін Кобрынскага раёна.

**Падпалаў Уладзіслаў Паўлавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2000. - Т. 11. - С. 504.
**Подпалов Владислав Павлович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 245.
**Подпалов Владислав Павлович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. - Минск, 2008. - Т. 6. - С. 129.
**Падпалаў Уладзіслаў Паўлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 104-106.
**Падпалаў Уладзіслаў Паўлавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 99-101. : фат.

### *Да 65-годдзя з дня нараджэння А. Паплаўскага (1958)*

**Паплаўскі Алесь** нарадзіўся 4 чэрвеня 1958 г. у в. Мазуры Кобрынскага раёна. Паэт, празаік, крытык. Аўтар кніг паэзіі «Спынены лістапад», «Незваротнасць», кніг прозы «Тэрыторыя скразнякоў», «Пастка для рэха». Жыве і працуе ў Брэсце.

**Паплаўскі, А.** Пастка для рэха : аповесці / Алесь Паплаўскі. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2009. – 223 с.

**Паплаўскі, А.** Скрыжалі душы / Алесь Паплаўскі. - Мінск, 2013.- 112 с.

**Паплаўскі, А.** Тэрыторыя скразнякоў : аповесці / Алесь Паплаўскі. - Брэст, 2004. – 324 с.

**Валасюк, Л.** Спынены лістапад / Л. Валасюк // Непрыдуманыя партрэты / Л. Валасюк. – Мінск, 2014. – С. 186-187.

### *110 гадоў з дня нараджэння П. Н. Паплаўскага (1913)*

**Паплаўскі Піліп Ніканавіч** нарадзіўся ў 1913 г. у в. Мазуры. Быў членам КПЗБ. Пасля акупацыі Кобрынскага раёна 23 чэрвеня 1941 г. стварыў групу з 11 чалавек, потым камандзір атрада імя Кірава. У жніўні 1943 г. быў па-здрадніцку забіты.

**Паплаўскі Піліп Ніканавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 217 - (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

### *70 гадоў з дня нараджэння В. І. Прымачука (1953)*

**Прымачук Віктар Іванавіч** - акадэмік, сапраўдны член (акадэмік) Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій (МАІТ), прафесар, доктар МАІТ у вобласці інфармацыйных тэхналогій. Нарадзіўся 24 кастрычніка 1953 г. у в. Мацы Кобрынскага раёна. Працаваў на будаўніцтве Байкала-Амурскай магістралі, дзе прайшоў шлях ад майстра да начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела будаўнічага падраздзялення. Працаваў у Міністэрстве агульнага машынабудавання СССР намеснікам, начальнікам аддзела капітальнага будаўніцтва. Займаўся будаўніцтвам шэрагу буйных і ўнікальных аб'ектаў. У 2012 г. узнагароджаны знакам «За обеспечение космических стартов», знакам «За преданность Владивостоку». Мае ордэн «За верность традициям»». Аўтар больш 30 навуковых прац, 3 вынаходстваў. У 2012 г. удастоены звання «Заслужаны будаўнік Расійскай Федэрацыі

**Прымачук Віктар Іванавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 141. : фат.

**Новый** директор // Владивосток. – 2009. – 2 июня. - В Дальневосточной дирекции Росстроя - новый генеральный директор Виктор Иванович Примачук.

**В «Дальневосточной** дирекции Росстроя» - новый руководитель [Электронный ресурс] // Восток-Медиа. – Режим доступа: https://vostokmedia.com/news/society/01-06-2009/v-dalnevostochnoy-direktsii-rosstroya-novyy-rukovoditel. – Дата доступа: 12.11.2019.

### *80 гадоў з дня нараджэння Л. П. Прымачука (1943)*

**Прымачук Леанід Платонавіч** - вучоны-матэматык, кандыдат фізіка-матэматычных навук (1970), дацэнт (1980). Нарадзіўся 13 жніўня 1943 г. у в. Мацы

Кобрынскага раёна. У 1960 г. закончыў Стрыгаўскую сярэднюю школу і паступіў на матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ). У БДУ працаваў з 1967 па 2008 гг. на пасадзе малодшага навуковага супрацоўніка, асістэнта кафедры матэматычнага аналізу, дацэнта кафедры тэорыі функцый, намесніка дэкана. З 1985 па 1996 гг. Леанід Платонавіч - дэкан механіка-матэматычнага факультэта. Апублікаваў звыш 50 навуковых і навукова-метадычных прац.

**Прымачук Леанід Платонавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Прымачук Леанід Платонавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 116-117.

### *160 гадоў з дня нараджэння М. Радзевіч (1863)*

**Марыя Радзевіч** (1863-1944) - польская пісьменніца, аўтар больш за 40 аповесцей і навел, прысвечаных жыццю палескай шляхты і сялянства, прыродзе і побыту простых людзей, а таксама настальгічнаму патрыятызму, ідэалізацыі патрыярхальнага мінулага. Нарадзілася 2 лютага 1863 года. Большую частку жыцця (з 1881 па 1939) правяла ў маёнтку Грушава (Кобрынскі павет), дзе пісала свае творы, якія друкаваліся ў Варшаве.

**Марыя Радзевіч** // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. - Мінск, 1986. - Т.4. - С. 449.

**Мешечко, Е. Н.** Радзевич Мария / Е. Н. Мешечко // Путешествие по Беларуси. В краю Немана, Западного Буга и Припяти / Е. Н. Мешечко. - Брест, 2012. - С. 238.

**Радзевіч Марыя** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 65. – (Лёсам звязаны з Кобрыншчынай).

### *125 гадоў з дня нараджэння П. І. Ратайкі (1898)*

**Ратайка Пётр Іванавіч** (1898–1982) - дзяржаўны дзеяч БССР. Нарадзіўся 13 студзеня 1898 г. у в. Пескі Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці). У 1938-1955 гг. выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны 6 ордэнамі і медалямі. 6 снежня 1967 г. Ратайка Пятру Іванавічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Гродна».

**Ганаровыя** грамадзяне горада Гродна ў пасляваенны перыяд. Ратайка Пётр Іванавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка горада Гродна. – Мінск, 1999. – С. 683. – (З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны).

**Долготович, Б. Д.** Романюк Иван Леонтьевич / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 204-205.

**Плешавеня, А. М.** Першы старшыня / А. М. Плешавеня // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка горада Гродна. – Мінск, 1999. – С. 330, 331. – (На крутым павароце гісторыі).

**Ратайка Пётр Іванавіч** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1972. – Т. 9. – С. 132.

**Ратайка Пётр Іванавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ;

склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі : інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 72-73. : каляр. іл.

### *110 гадоў з дня нараджэння Г. М. Рыфера (1913)*

**Рыфер Генрых Мельхіёравіч** (1913–1979). Нарадзіўся 24 верасня 1913 г. у в. Вальрот (у наваколлі г. Касель, Германія). У 1942 г. у складзе акупацыйнай арміі прыбыў у Кобрынскі раён, служыў у ахове чыгункі, дзяжурным на станцыі Лясы на лініі Жабінка - Баранавічы. Партызаны наладзілі з ім сувязь, і па заданні атрада імя Чапаева Г. М. Рыфер арганізоўваў крушэнне цягнікоў, перадаваў партызанам боепрыпасы, звесткі аб руху цягнікоў. За ўдзел у антыфашысцкай барацьбе ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені. Пасля вайны жыў у Кобрыне.

**Рыфер Генрых Мельхіёравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 224-225 - (Змагаліся ў тыле ворага).

### *85 гадоў з дня нараджэння А. Ф. Свідуновіча (1938)*

**Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч** (1938–2008) - кандыдат багаслоўя. Нарадзіўся ў 1938 г. у в. Дзівін Кобрынскага раёна**.** З 1988 г. Аляксандр Свідуновіч - настаяцель Свята-Мікалаеўскага сабора, благачынны цэркваў г. Днепрадзяржынска. Яго заслугі былі адзначаны мноствам царкоўных і дзяржаўных узнагарод. 8 снежня 2008 г. А. Ф. Свідуновіч памёр.

**Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Гапанович, А. Н.** Александр Федорович Свидунович / Афанасий Гапанович // Дивин — древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 76. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч** // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні **:** гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 46.

**Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 120-121.

### *100 гадоў з дня нараджэння В. Р. Селіванюка (1923)*

**Селіванюк Васіль Раманавіч** (1923–2002). Нарадзіўся ў 1923 г. у г. Высокае Камянецкага раёна. Заслужаны меліяратар (1973). Працаваў машыністам гусенічнага крана ПМК-52 Кобрынскага раёна. У 1973 г. прысвоена ганаровае званне «Заслужаны меліяратар Беларускай ССР».

**Селіванюк Васіль Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Селіванюк Васілій Рыгоравіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 102. : фат.

### *100 гадоў з дня нараджэння В. П. Сёміна (1923)*

**Сёмін Вячаслаў Паўлавіч** нарадзіўся ў 1923 г. у Маскве. У Вялікую Айчынную вайну служыў начальнікам радыёстанцыі 2-га стралковага батальёна 37-га гвардзейскага Кобрынскага пяхотнага палка. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Сёмін Вячаслаў Паўлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 238 - (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *100 гадоў з дня нараджэння П. П. Сігорскага (1923)*

**Сігорскі Павел Пятровіч** (1923–1996). Нарадзіўся 29 чэрвеня 1923 г. у г. Кобрыне*.* Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Удзельнічаў у вызваленні Варшавы, штурме Берліна. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Славы II ступені, медалямі. Памёр 23 сакавіка 1996 г.

**Сігорскі Павел Пятровіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 239 - (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *100 гадоў з дня нараджэння Я. Я. Сілюка (1923)*

**Сілюк Якаў Якімавіч** нарадзіўся ў 1923 г. у в. Ягалкі. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў сувязным, байцом партызанскага атрада імя Фрунзе брыгады імя Сталіна. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны працаваў старшынёй Пецькаўскага, Яроміцкага сельсаветаў, інструктарам Кобрынскага райкама партыі, старшынёй калгаса «Праўда» Кобрынскага раёна.

**Сілюк Якаў Якімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 225-226. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *50 гадоў з дня нараджэння А. У. Сінкаўца (1973)*

**Сінкавец Аляксандр Уладзіміравіч** - кандыдат біялагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся Аляксандр Сінкавец 4 красавіка 1973 г. у в. Дзівін Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1990 г. закончыў Дзівінскую сярэднюю школу з залатым медалём. Паступіў у Віцебскі ветэрынарны інстытут, у 1995 г. закончыў Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны (ВДАВМ) па спецыяльнасці «Ветэрынарыя». Апублікавана 22 навуковыя працы, у тым ліку 7 вучэбна-метадычных.

**Гапанович, А. Н.** Александр Владимирович Синковец / Афанасий Гапанович // Дивин - древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. – С. 77. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Сінкавец Аляксандр Уладзіміравіч** // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 51-52.

**Сінкавец Аляксандр Уладзіміравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 127-128.

### *95 гадоў з дня нараджэння Г. А. Сташэўскай (1928)*

**Сташэўская Ганна Антонаўна** нарадзілася ў 1928 г. у в. Конань Рэчыцкага раёна. У 1961-1972 гг. - выхавацель Гарадзецкай школы-інтэрната, выхавацель групы прадоўжанага дня Гарадзецкай СШ (1972-1983). Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1965 г.

**Сташэўская Ганна Антонаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 430-431. – (Вызначыліся працай).

**Сташэўская Ганна Антонаўна** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 113. : фат.

### *105 гадоў з дня нараджэння А. В. Сунцава (1918)*

**Сунцаў Андрэй Васільевіч** (1918–1983). Нарадзіўся 15 кастрычніка 1918 г. у в. Стары Цяжынскага раёна Кемераўскай вобласці. Прымаў удзел у абароне Сталінграда. Закончыў вайну ў маі 1945 г. у званні капітана. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені. З 1948 г. жыў у Кобрыне, працаваў у розных арганізацыях горада.

**Сунцаў Андрэй Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 245 - (Крутымі дарогамі вайны).

### *45 гадоў з дня нараджэння Р. М. Супруновіч (1978)*

**Супруновіч Рыта Міхайлаўна** – беларускі вучоны-эканаміст, нацыянальны эксперт, кансультант, перакладчык. Нарадзілася ў 1978 г. у г. Кобрыне Брэсцкай вобласці. Аўтар звыш 30 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій. Сфера навуковых інтарэсаў: рэгуляванне міжнароднай працоўнай міграцыі, міжнародны рынак працы, міжнародныя эканамічныя адносіны ў сферы рынку працы, працоўнай міграцыі.

**Супрунович Рита Михайловна** : об авторе // Беларуская думка. – 2013. - № 9. – С. 77-83.

**Супрунович Маргарита Михайловна** [Электронный ресурс] // Экономика by. – Режим доступа: http://ekonomika. by/ekonomisty/ suprunovich-margarita-mikhajlovna. – Дата доступа: 22.03.2017.

### *125 гадоў з дня нараджэння Д. Н. Фалькоўскага (1898)*

**Фалькоўскі (сапраўднае – Ляўчук) Дзмітрый Нікіфаравіч** (1898-1934) - паэт. Нарадзіўся 3 лістапада 1898 г. у в. Вялікія Лепясы. Лепшае, што ён стварыў - тонкія лірычныя творы, многія з якіх прысвечаны родным мясцінам. 17 снежня 1934 г. паэта не стала. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1957 г. У Лепясах ёсць вуліца Фалькоўскага, а на месцы, дзе некалі стаяла яго родная хата, – мемарыяльны знак.

**Дзмітрый Фалькоўскі** // Літаратурная карта Берасцейшчыны. - Брэст, 2008. – С. 314-315.

**Дмитрий Фальковский** (1898-1934) // До тебе, світе... українська література Берестейщини. Київ, 2003. - С. 188-208.

**Ляшук, В. Я.** Фалькоўскі Д. / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко // Літаратурная Берасцейшчына: краязн. нарысы, партрэты, арт. / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. - Мінск, 2008. - С. 210-211.

**Фальковский Дмитрий Никифорович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. – В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2-х кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. – С. 430.

**Фалькоўскі** (сапраўднае прозвішча – Ляўчук) **Дзмітрый Нікіфаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 442-443. - (Імі ганарацца землякі ).

**Фалькоўскі Дзмітрый** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск., 2003. - Т. 16. - С. 311.

**Другак, Ю.** Воспоминания о поэте / Юрий Другак // Кобрынскі веснік. - 2018. — 31 кастрычніка. — С. 5. - К 120-летию со дня рождения уроженца д. Большие Лепесы поэта Дмитрия Фальковского.

### *75 гадоў з дня нараджэння Р. М. Філімоненкавай (1948)*

**Філімоненкава (Кукіна) Раіса Мікалаеўна** – вучоны, кандыдат тэхнічных навук (1982) , дацэнт (1991). Нарадзілася 25 лютага 1948 г. у г. Дуброўна Віцебскай вобласці. Пражывала ў Кобрыне з 1960 г па 1968 г. Закончыла СШ № 2 г. Кобрына і паступіла ў Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці. Р. М. Філімоненкава мае больш за 120 навуковых і звыш 50 метадычных публікацый, у тым ліку адзін падручнік і тры вучэбных дапаможніка з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Філімоненкава (Кукіна) Раіса Мікалаеўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 144-146.

### *105 гадоў з дня нараджэння А. М. Фіначкі (1918)*

**Фіначка Аляксандр Максімавіч** (1918–1987). Нарадзіўся ў 1918 г. у пас. Вялікае Фёдараўскага раёна Кустанайскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у вызваленні Кобрына, Брэста, Варшавы, штурме Берліна. Узнагароджаны медалямі. Пасля дэмабілізацыі ў 1950 г. жыў і працаваў у Кобрыне. Памёр 3 сакавіка 1987 г.

**Фіначка Аляксандр Максімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 246. - (Крутымі дарогамі вайны).

### *75 гадоў з дня нараджэння М. Н. Хабібуліна (1948)*

**Хабібулін Мансур Набіулавіч** - маёр. Нарадзіўся 2 жніўня 1948 г. у г. Новасібірску (Расія). Служыў у Беларускай ваеннай акрузе. Прымаў удзел у ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, за што ўзнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме ва Узброеных СССР» ІІІ ступені. 3 1987 г. - у Афганістане. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пахаваны на могілках в. Пецькі.

**Хабібулін Мансур Набіулавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 447. - (Загінулі ў Афганістане).

### *100 гадоў з дня нараджэння В. А. Хоміча (1923)*

**Хоміч Васіль Андрэевіч** нарадзіўся 13 кастрычніка 1923 г. у в. Сычова Жабінкаў-скага раёна. З 1940 г. да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у будаўніцтве абарончых збудаванняў пад Брэстам. Ваяваў у партызанскім атрадзе імя Фрунзе брыгады імя Сталіна ў складзе разведвальна-дыверсійнай групы. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, медалямі. Пасля вызвалення Брэстчыны ад фашысцкіх захопнікаў служыў у органах НКУС Кобрына, з 1951 г. працаваў інспектарам сыравіннага аддзела Кобрынскага кансервавага завода, з 1967 г. - майстрам у «Міжкалгасбудзе».

**Хоміч Васіль Андрэевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 226-227. - (Змагаліся ў тыле ворага).

### *100 гадоў з дня нараджэння С. М. Шабашова (1923)*

**Шабашоў Сяргей Міхайлавіч** (1923–2007). Нарадзіўся 1 мая 1923 г. у в. Драгуны Лёзненскага раёна. Закончыў Магілёўскі педінстытут (1956), ВПШ пры ЦК КПСС (1961). У 1961-1962 гг. першы сакратар Кобрынскага райкама КПБ. З 1962 года – начальнік Кобрынскага калгасна-саўгаснага ўпраўлення Брэсцкай вобласці. За баявыя і працоўныя заслугі перад Радзімай узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Айчыннай вайны І і ІІ ступеней, ордэнам «Знак Пашаны», Працоўнага Чырвонага Сцяга (тройчы), шматлікімі медалямі. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР трох скліканняў. Ганаровы грамадзянін горада Віцебска.

**Шабашоў Сяргей Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 456. - (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Шабашоў Сяргей Міхайлавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 27. : фат.

### *65 гадоў з дня нараджэння У. В. Шапяцюка (1958)*

**Шапяцюк Уладзімір Васільевіч,** лейтэнант. Нарадзіўся 26 жніўня 1958 г. у в. Лелікава Кобрынскага раёна. Служыў у Афганістане. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна), медалём. Пахаваны на могілках в. Лелікава.

**Шапяцюк Уладзімір Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 447-448 - (Загінулі ў Афганістане).

**Шапяцюк Уладзімір Васільевіч** // Памяць. Афганістан. - Мінск, 1991. - С. 470-471.

**Суворов, А. М.** Воины-интернационалисты Кобринского района / А. М. Суворов // На линии огня воины-интернационалисты Брестской области в Афганской войне / А. М. Суворов. -Брест, 2010. - С. 174-177, 210, 244-247.

### *90 гадоў з дня нараджэння Г. Р. Шаўчук (1933)*

**Шаўчук Ганна Рыгораўна** нарадзілася ў 1933 г. у в. Нятрэба. Заслужаны работнік аховы здароўя (1982). Працавала в.а. галоўнага ўрача Гарадзецкай урачэбнай амбулаторыі.

**Шаўчук Ганна Рыгораўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Шаўчук Ганна Рыгораўна** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 118. : фат.

### *75-гадоў з дня нараджэння В. Ф. Швайко (1948)*

**Швайко Валянціна Фёдараўна** - вучоны, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт Нацыянальнага інстытута адукацыі, загадчык кафедры методыкі выхавання Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі. Нарадзілася ў 1948 г. у в. Астромічы.

**Швайко Валянціна Фёдараўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 444. – (Імі ганарацца землякі).

**Швайко Валянціна Фёдараўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 152-153.

### *115 гадоў з дня нараджэння М. Ц. Шыша (1908)*

**Шыш Мікалай Цімафеевіч** нарадзіўся ў 1908 г. у в. Худлін. У гады Вялікай Айчыннай вайны камандзір партызанскага атрада, які дзейнічаў у зоне Дняпроўска-Бугскага канала. У 1942 г. М. Ц. Шыш загінуў у адным з баёў. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, яго імем названы створаны ім атрад у брыгадзе імя Молатава, вуліцы ў г. п. Антопаль, на радзіме ў в. Худлін пастаўлены помнік.

**Шыш Мікалай Цімафаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 218 - (Змагаліся ў тыле ворага).

### *100 гадоў з дня нараджэння А. Д. Шышко (1923)*

**Шышко Андрэй Давыдавіч** нарадзіўся ў 1923 г. у в. Турная. У гады Вялікай Айчыннай вайны сувязны партызанскіх груп, партызан атрада імя Суворава брыгады імя Молатава Пінскага партызанскага злучэння. Удзельнічаў ў вызваленні Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў. Удзельнічаў у вайне з Японіяй. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Шышко Андрэй Давыдавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 227. - (Змагаліся ў тыле ворага).

### *125 гадоў з дня нараджэння В. П. Энгельгарта (1898)*

**Энгельгарт Васілій Паўлавіч** (1828–1915) - астраном і мецэнат, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН (1890), доктар астраноміі. Нарадзіўся 17(29) ліпеня 1828 г. у в. Кустовічы Гродзенскай губерні. Паходзіў са знакамітага шляхецкага роду Энгельгардтаў. Закончыў Пецярбургскае вучылішча правазнаўства. У снежні 1889 г. В. П. Энгельгарт быў удастоены звання «Ганаровы доктар Казанскага ўніверсітэта». 1 снежня 1890 г. Васілій Паўлавіч выбраны членам-карэспандэнтам Пецярбургскай акадэміі навук па разраду матэматычных навук фізіка-матэматычнага аддзялення.

